Літаратурная ўкладка газеты

„РАГНЕДА“

№ 5 (7), 1994 год

Лявон ШПАКОЎСКІ-СЛУЧАНІН



РАГНЕДА

ПРА АЎТАРА ПАЭМЫ



Лявон Раманавіч Шпакоўскі нарадзіўся ў 1914 годзе ў вёсцы Лучнікі Слуцкага раёна. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут. Некаторы час настаўнічаў. Займаўся таксама літаратурнай творчасцю. Свае вершы і паэмы падпісваў псеўданімам Лявон Случанін.

Двойчы падвяргаўся рэпрэсіям. З 1973 года жыве на Беларусі, у горадзе Салігорску.

Упершыню паэма Л. Шпакоўскага-Случаніна «Рагнеда» была выдадзена асобнай кніжкай у Вільні ў 1944 годзе.

Ілюстрацыі да паэмы зрабіў мастак Уладас Дрэма. Другое выданне паэмы здзейснена ў 1956 годзе беларусамі Аўстраліі.

У 1991 годзе паэма надрукавана ў шматтыражцы «Калійшчык Салігорска» і ў часопісе «Спадчына».

Гістарычная даведка

Рагнеда, пра якую расказваецца ў аднайменнай паэме Лявона Шпакоўскага-Случаніна, была дачкой полацкага князя Рагвалода, жонкай вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаслававіча.

Як сведчаць летапісы, Уладзімір гвалтоўна забраў Рагнеду ў свой гарэм. Але гордая палачанка не скарылася лёсу...

Падзеі, апісаныя ў паэме, адбываліся ў другой палавіне дзесятага стагоддзя.

РАГНЕДА

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАЭМА

Прысвячаю дачцы Ларысе

Цяжка табе, галава,
Не на плячах;
Блага табе, цела,
Без галавы!
(«Слова аб палку Ігаравым»)

Уступ

Гей, крывіцкі народ — Беларусі сыны!
У мінуўшчыны слаўным кургане
Несупынна гудуць вечавыя званы,
На вялікае клічуць змаганне.

Годзе крыўду цярпець!
Прэч пакуты і здзек!
Веру — збудуцца нашыя мары!
Памятай, беларус, што і ты чалавек,
Які можа сабой гаспадарыць!

Нашы скарбы вякамі цягалі ад нас,
Нашу радасць у гразь утапталі.
У вялікі паход клічуць праўда і час,
Клічуць слаўнай мінуўшчыны далі.

Вось таму з паўзабытых курганаў-вякоў,
Ідучы зацярушаным следам,
Заклікае нашчадкі пазбыцца акоў
Маладая князёўна Рагнеда.

1

Дзе Палота-рака упадае ў Дзвіну,
Дзе драмала сасна на кургане,
Горад Полацак там (помніць хто старыну)
Узвялі крывічы-палачане.

Ад Палоты-ракі да сівога Дняпра,
Ад Бярозы да сіняга мора
Горад Полацак наш, быццам тая зара,
Зіхацеў над крывіцкім прасторам.

2

На шляху вадзяным, што прарэзаў
зямлю
З ваяўнічых варагаў у грэкі,
Карыстаў беларус і благую раллю,
І гнілыя балоты, і рэкі.

Векавыя лясы у люстэрка азёр
Заглядалі няголеным тварам.
І здавалася, гэты бязмежны прастор
Быў ахоплен зялёным пажарам.

3

Часта войны былі. Слаўны Полацак наш
Штурмавалі ліхія паляне.
Яны землі яго рабавалі усцяж
І багацці знішчалі дазвання.

Кіеў — прагны сусед, што свае кіпцюры
Працягаў на яго непрыстойна,
Не дабіўся навек палачан пакарыць —
Палачане жылі самастойна.

4

Слаўны Рогвалад-князь са сталіцы свае
Мудра княствам адноўленым княжыў.
Ён учынкі людзей, іх патрэбы усе
На вазе справядлівасці важыў.

Жыў свабодна тады беларускі народ.
Бараніў ён радзіму зацята.
І ні Захад яго, і ні дзікі Усход
Не саджалі за цёмныя краты.

На званіцах гулі вечавыя званы.
І ад страху нямелі чужынцы,
І не йшлі кожны год Беларусі сыны
У Сібір па халодным гасцінцы.

5

І з харомаў сваіх, што былі у сяле
Недалёка ад Полацку-граду,
Князь на белым кані, у парчовым сядле
У сталіцу спяшаў на параду.

Прыкрываў валасы пазалочаны шлём,
Яркім сонцам зіхцела кальчуга.
Вочы князя свяціліся дзіўным агнём...
А за князем — дружына і слугі.

На шырокім пляцы князь каня супыніў,
Ля тае вечавое званіцы.
І сказаў ён слузе ў той звон зазваніць,
Каб аж рэха ішло па зямліцы.

6

Звон магутны, густы знакам збору
служыў.
Разагнуўшы шырокія плечы,
Бег каваль і купец, бег ганчар і
мужык —
Сабіралася шумнае веча.

Гоман, жарты і смех размывалі
натоўп,
На вялікую справу прызваны.
Толькі там не было тураўчанаў-
братоў,
Ланцугамі няволі скаваных.

7

І прамовіў тады сонца яснае князь
Да народнага мудрага сходу:
— Вораг нашых братоў кінуў тварам
у гразь,
П'е шаломамі з Прыпяці воду.

Святаслава сыны разбіваюць ілбы,
Тураў туга сціскаюць аковы.
Там, дзе спрэчку вядуць маладыя
дубы,
Будзе нашым апошняе слова!

Зашумеў, быццам лес, беларускі
народ —
Трэба стала падумаць народу.
Потым крыкнулі ўсе: — На вялікі
паход
Мы даём непарушную згоду!

8

Славу ткалі гады. На крывіцкай зямлі
Панавалі і шчасце, і згода...
У харомах сваіх на пацеху усім
Вырастала дачка Рагвалода.

Залацістыя косы ёй сонца дало,
Дало неба ёй сінія вочы;
На квяцістым лугу за вішнёвым сялом
Дала лілія стан ёй дзявочы.

Навучыла жыццё волю светлую піць
І ніколі не знацца з прымусам.
Навучыла зямля, як радзіму любіць,
Як любіць крывічан-беларусаў.

9

У маленстве бабуля расказвала ёй,
Як над краем кружылі віхуры,
Як быў бацькам яе і мячом і крывёй
Да радзімы далучаны Тураў:

— Грознай хмарай князёва дружына плыла,
І ляцелі агністыя стрэлы.
Вораг зломаны трупамі поле услаў
І у стэпы уцёк азвярэлы.

Князя-сонца назад на руках прыняслі,
Яго справы пакрылі хвалою.
Звон збавення звінеў на крывіцкай
зямлі,
Вораг нема стагнаў за Сулою...

Многа розных легенд, многа казак
жыцця
Расказала бабуля князёўне.
І Рагнеда плыла у жыццёвы прасцяг
На жыццём зачарованым чоўне.

10

У юнацтве яна на улонні дуброў
Назірала забавы народу.
Разгаралася сонцам дзявочая кроў,
Калі моладзь вяла карагоды.
Смех і песні звінелі за ціхім сялом,
Адганялі нячыстую сілу.
Мітусілася вогнішча бурным агнём,
Асвятляючы бога Ярылу.

11

А дзяўчаты на рэчцы пускалі вянкі
(Можа, мілы да сэрца прытуліць),
Іх адносілі хвалі бурлівай ракі,
А Рагнеды вянкі затанулі.

— Цяжка будзе табе віць кахання
вянкі, —
Гаварылі дзяўчаты гурбою.
А Рагнеда глядзела на хвалі ракі,
І сціскалася сэрца тугою.

12

— Дзе ты, наша шчасце, дзе ты,
наша доля:
Вы расталі, мабыць, як крупінка солі.
Вы расталі, мабыць, у слязах
дзявочых,
Што начамі роняць маладыя вочы...

Так спявалі сяброўкі, і песня плыла,
Быццам цень, у прасторы маўклівыя.
Кветка шчасця Рагнеды, як сон,
адцвіла,
У душы — прадчуванні жахлівыя.

Стала пуста у сэрцы, прапаў супакой,
Сумавалі у лесе бярозкі.
І застыла Рагнеда над цёмнай ракой,
Абрываючы з красак пялёсткі.



13

Златаверхі харом сярод Кіева быў.
Ён раўняўся з гарамі крутымі.
Злом праслаўлены князь у тым хораме жыў —
Святаславіч там жыў Уладзімер.

А яго два браты — Яраполк і Алег —
Тыя самыя песцілі мары:
Кожны прагна жадаў стаць усім на чале
І самому жыццём гаспадарыць.

Не маглі падзяліць маладыя князі
Свайго бацькі багацце і славу.
І адзін аднаму не маглі дагадзіць
Тры пыхліўцы — сыны Святаслава.

І шукалі сабе дапамогі яны
Праз жанімства з дачкой Рагвалода,
Каб сваяцтва сваё скарыстаць для вайны
І мячом дамагчыся згоды.

14

Сын рабыні — Уладзімер і князь Яраполк
Шлюць сваты да цудоўнай Рагнеды.
Іх гасцінна саджаюць за князевы стол
Для вялікай і важнай бяседы...

Апусціла Рагнеда сваю галаву.
Ціхім смуткам зардзеліся вочы...
І здавалася ёй: маладую траву
Вырваць з поля радзімага хочуць.

Прыгадала яна і купальскі вянок,
І бурлівыя цёмныя хвалі,
А на шыі чарнеўся вузенькі шнурок,
На шнурочку — з брыльянтаў каралі.

15

І Рагнеда, душою не крывячы,
Адказала усім на бяду:
— Не жадаю разуці рабыніча,
З Яраполкам я шчасце знайду!

Маладое князёўны рашучы адказ
На Уладзімера громам зваліўся.
А дружыннік, што выканаў княжы наказ
Безгаловым на дол паваліўся...

На залітым крывёю ганку
Князя чорныя думы грызуць:
«Я прымушу цябе, палачанку,
Мае стройныя ногі разуць!»

16

І мячамі пакрылася поле.
 Злосна пікі на сонцы гарацъ.
Застагналі густыя таполі,
Прапускаючы грозную рацъ.

А насустрач яму светлы Рогвалад-
На сваім белагрывым кані
Страмянамі звінеў залатымі,
Помсты дзікай распальваў агні.

Быць крывавым дажджам - навальніцам,
Немым голасам выць перунам,
І заплакаць лазінкам ніцым,
І ламацца магутным дубам.

17

А насустрач яму светлы Рогвалад-
князь
Ехаў разам з сваімі сынамі.
Пад нагамі у коней гудзела зямля,
Чырванелася поле шчытамі...

Стрэлы пырснулі буйным, смяротным
дажджом,
Узвіліся сталёвыя пікі.
Свішча Рогвалад - князь харалужным
мячом,
Заглушаючы енкі і крыкі.

18

Памагаюць яму маладыя сыны —
Колюць пікамі, крышаць мячамі.
Толькі долі свае не дагналі яны,
Бо засада была за плячамі.

Нечаканым віхром задымілі палі,
Сонца хмары закрылі густыя...
І ляжалі снапамі на роднай зямлі
Рагвалод і сыны удалыя.

19

Доўга біўся тады беларускі народ,
Бараніў незалежнасць, свабоду.
Толькі князь Уладзімір закончыў
паход —
Стаў з дружынай на горла народу.

Горад Полацак наш зруйнавалі яны.
Горкім смуткам дымяцца руіны.
Палачанскае мяса клююць груганы
На прасторах няшчаснай краіны.

Застагнала зямля, роняць слёзы лясы,
Люд крывіцкі нязмерна гаруе.
За Дзвіною замоўклі дзяўчат галасы.
Уладзімер з дружынай піруе.

20

А князёўна мая на высокай сцяне,
Што надзейна вартуе палацы,
Белай зданню стаіць, злога князя кляне,
Кліча з ворагам лютым змагацца:

— Падымайся, народ! Клічуць сурмы цябе,
На вялікае клічуць змаганне.
Кроў і здзекі нясе вораг люты табе,
Твая радасць у горы растане.

Не пускай ты чужых на святую зямлю,
Што заліта крывёю і потам.
У цябе адбяруць яны волю тваю
І растопчуць крывавым ботам.

Закуюць яны нас у свае кайданы,
Нашы слаўныя дні абяздоляць.
Будуць гора цярпець крывічанаў сыны
У пакутнай варожай няволі!

На высокі палац месяц глянуў ярчэй,
Захісталіся ніцыя лозы.
У князёўны мае з васільковых вачэй
Пакаціліся горкія слёзы.

21

Гэй! Разбоем праслаўлены князь!
Слухай мову крывіцкай князёўны.
Не удасца табе кінуць тварам у гразь
Беларускі народ непакорны.

Будуць зноў навальнічныя дні,
Будзе грозная сеча паходу.
У вялікім змагарным агні
Беларус заваюе свабоду!

22

Дымнай раніцай вораг драпежны
плячом
Падпіраў залатыя палацы.
Сярод вояў стаяла Рагнеда з мячом,
Заклікала да смерці змагацца...

Толькі сілы няроўныя ў бойцы былі,
І ў гарачым змаганні расталі...
Маладую Рагнеду ў палон узялі
І вяроўкай к сядлу прывязалі.

23

Прагны кіеўскі князь, што дабіўся
свайго,
Пераможна глядзеў на Рагнеду.
У душы разгараўся кахання агонь, —
Не пакінуўшы помсты і следу.

Толькі вочы князёўны адплатай гараць,
Поле косы мятуць залатыя...
Павязла яе князева раць
У вайною праслаўлены Кіеў.

24

Пасадзілі за краты князёўну маю,
У нямілы ёй кіеўскі хорам.
За вакном кіяўлянкі вяселле пяюць,
Сэрца пеніцца крыўдай і горам.

Лебядзінымі хмаркамі думкі плылі,
Аплывалі святую радзіму;
Развітальнаю песняю вішні цвілі,
Бор лісткамі шумеў маладымі.

І, здавалася, сонца свяціла ярчэй
На шляху заварожаным думам.
І пакрыліся вейкі дзявочых вачэй
Несуцешным слязінкавым сумам.

25

Выплыў бацька на белым гарачым
кані,
Два браты, пазалочаны хорам...
Пакаціліся зорамі светлыя дні
І згарэлі у чорным прасторы.

Як марудна, як нудна хвіліны плывуць,
Дарагая **мая непаседа,**
Палажыўшы на рукі сваю галаву,
Доўга плакала горка Рагнеда.

26

Адазваўся рыпліва сталёвы замок,
Волі князевай ён пакарыўся.
І праслаўлены злом Святаслава сынок
У Рагнеду вачама упіўся.

Уладзімер:

— **Птушка, мабыць, шчаслівa у клетцы жыве**
І не дбае аб сонцы і волі.
Песціць горды адказ у сваёй галаве
І не будзе рабыняй ніколі...

Не да твару, Рагнеда, табе жартаваць.
Я згараю у мроях кахання.
Дай руку мне сваю, пойдзем дні каратаць,
Нават крыўда у шчасці растане.

Р а г н е д а:

— Паглядзі на сябе: твае рукі ў крыві,
Твае справы заліты крывёю...
Я не жонка табе, лютым катам слыві
Над няшчаснай крывіцкай зямлёю!

Вочы князя палалі намерам благім.
Нават слугі яго анямелі.
Загадаў ён Рагнеду ваякам сваім
Пасадзіць у сырым падзямеллі.

27

І над лёсам сваім у скляпенні сырым
Доўга думала наша князёўна;
Горка плакаў народ, сумавалі бары
І дзялілася шчасце няроўна.

І хацела яна на сябе налажыць
Беласнежныя тонкія рукі.
Толькі мусіць народ не загінуць, а жыць
І пазбыцца варожае мукі.

І сказала яна: — У ахвяру сябе
Я прыношу крывіцкаму люду.
Сцяўшы сэрца сваё, я разую цябе,
Але крыўды людской не забуду!

28

Ужо вярнуліся буслы,
Відаць, вясна не за гарамі...
І князь дубовыя сталы
Заслаў старанна абрусамі.

Харомы пеняцца святлом,
Палаюць кубкі дзіўным хмелем.
Сядзіць Уладзімер за сталом,
Спраўляе гучнае вяселле.

А на пасадзе, быццам ноч,
Сядзіць задумная Рагнеда.
З яе не зводзіць хмельных воч
Уся шумлівая бяседа.

Іх вочы радасцю гарачь,
Звіняць успененыя шклянкі.
Сышліся плакаць і спяваць
З усіх ваколіц кіяўлянкі.

Бадзёра музыка грыміць,
І песні коцяцца на мілі.
Такое шумнае гульні
Яшчэ не бачылі, не снілі.

29

Падняў руку вясёлы князь,
Стрымаў шумлівую бяседу,
Сказаўшы ўсім: — Яна мая! —
Ён кубак выпіў за Рагнеду.

Рагнеды твар агнём палаў,
І сэрца помстай бушавала:
О, колькі крыўды, колькі зла
Прынесла князева навала!..

Аж цэлы тыдзень там пілі,
Крычалі «соладка» і «горка»...
У твар варожае зямлі
Глядзела сумна наша зорка.

30

І дні, як рэкі, паплылі.
Яна рабыніча разула.
Ляцелі з крыкам жураўлі,
І лета яснае заснула.

Калі жыццё пайшло на глум,
Як адспявана песень крышку,
Агорне сэрца дзікі сум,
І пальцы мкнуцца да кілішку.

Жыцця не мае камышыт.
Ці можа сітнік гэта ведаць?
Расціла помсту у душы
Мая чароўная Рагнеда.

Яе не цешыў белы свет
І сонца цёплае не грэла,
І асыпаўся макаў цвет
З яе замучанага цела.

Агонь зямны даўно патух,
І свет здаваўся апусцелым.
І толькі моцны вольны дух
Лунаў у сэрцы скамянелым.

31

А бывалі часы, неадпомшчаны муж
Заварожваў Рагнеду каханнем.
І дарыла яна нават ласкі яму
У палацы, распешчаным раннем.

Толькі хутка ізноў астывала душа.
Усплывала балючае гора:
І звінелі забытыя словы ў вушах
Нейкім вострым калючым дакорам.

Страшнай помсты нязгасным агнём
Разгаралася шчырае сэрца:
— Той, хто плаціць няволяй і злом,
Ад рукі мае мусіць памерці!

32

Так казала Рагнеда, і помсты агонь
У пакрыўджаным сэрцы насіла.
Часта меч яна брала ў святую далонь
І валодала ім, як асілак.

Выплывалі далёкія дні:
Кроў, знішчэнне, пажары, руіны,
У раз'юшаным зыркім агні
Спапялелае сэрца краіны.

Заняволены хілы народ,
Дзікім мохам парослыя сёлы,
І купальскі жывы карагод,
І расцвілыя кветкамі долы.

— Не! Не будзе краіна мая
У нявольніцкім горы тапіцца.
Покуль цела трымае зямля,
Трэба шчасця уволю напіцца!

33

Нечым новым Рагнеда жыве.
Залатое юнацтва мінула...
І адчула яна, што пад сэрцам яе
Нешта сонную ціш скалыхнула.

Невядомым, суцешным цяплом
Залілося жаночае цела.
Нейкім новым нябачным агнём
У Рагнеды душа палымнела.

Раптам гора і смутак уцёк,
Песцяць мары жаданае шчасце.
У душы найцяплейшы куток
Захавала Рагнеда дзіцяці.

34

І вось тады, калі прыйшла вясна,
Зазелянелі шоўкавыя травы,
Радзіла сына першага яна,
Якога потым звалі Ізяславам.

І гэты любенькі, здаровенькі сынок,
Што у жыццё сабе адчыніць дзверцы,
І быў той цёпленькі жывенькі камячок,
Што ціха жыў у мацеры пад сэрцам.

А на улонні светлае вясны
Цвілі сады цяплом і шчасцем белым.
Рагнеда сніла залатыя сны
І на сынка з надзеяю глядзела.

35

Уладзімер, стомлены і славай і вайной,
Малога позіркам расчуленым акінуў.
Палалі вочы свежаю вясной,
І ён сказаў народжанаму сыну:
— Расці, мой сын, у розуме і сіле.
У войнах жорскіх скора я згару.
Ты дай зарок на бацькавай магіле —
Вясці да сонца Кіеўскую Русь...
Наказваў князь маленькаму герою
Надзеі бацькавы дапрасці і ссукаць
А губы тонкія свяціліся крывёю,
У мяккі лоб цалуючы сынка.

36

Міналі дні. Самотная Рагнеда,
Як воды бурныя — шырокая рака,
Вяла сваім непераможным следам
Свайго маленькага бадзёрага сынка.
Яна у сэрцы сына распаліла
Святою помстаю палаючы агонь
Яе душы разгневаная сіла
Дарогай роднаю вяла яго.
Начамі доўгімі над сынавай калыскай
Спявала песні сумныя яна...
Хадзілі хмары над зямлёю нізка,
А за вакном скуголіла зіма.

37

Амаль штодня зімовою парою
Яна з сынком гуляла у мячы.
Чарнявы хлопчык моцнаю рукою
Вучыўся ворага бязлітасна сячы.
Падняўшы меч, ён грозна хмарыў бровы,
Назад адкінуўшы крутую галаву.
Яму здавалася, што падаюць галовы
Падгнілым яблыкам у мяккую траву.

38

Рагнеда сыну падарыла ласкі.
Каханне мацеры не ведала мяжы.
Яна яму сама складала казкі,
Сама імкнулася жыццём завараджыць:

— За высокімі гарамі,
За глыбокімі марамі,
Дзе цяпер лютуюць зімы,
Землі нашае радзімы.

Там гібеюць палачане,
Бацька твой у іх мячамі
Адабраў зямлю і волю,
Абняславіў нашу долю.

Плачуць цёмнымі начамі
У няволі крывічане.
Дні жыцця на пальцах лічаць,
Да сябе яны нас клічуць.

Падрастай, сынок любімы,
Будзь збавіцелем радзімы.
Хай загіне стан варожы!
Хай цвіце наш край прыгожы!

І бачыў сын у гэтыя часінкі,
Народ знясілены, азмрочаны абшар.
А мацеры гарачыя слязінкі
Павольна капалі на сынаў твар.

39

З благім намерам шостыя радзіны
Спраўляе сёння вераломны князь.
Над галавою сумнае княгіні
Ён кубак пеністы зняважліва узняў.

Высокі хорам у маўчанні стыне.
І князь сказаў на руку сатане:
— Я п'ю за гордую крывіцкую рабыню,
Дачку якая нарадзіла мне!

40

Смяяўся князь, смяялася бяседа,
У вокны хораму глядзела грозна ноч.
Рукой дрыжачаю самотная Рагнеда
Схапіла доўгі залацісты нож.

Пачуўшы нечаканую абразу,
На мужа лютага, што быў крыніцай зла,
Рукой дрыготкаю, без роздуму, адразу
Рагнеда нож булатны занясла.

41

Ахутаў страх разгульную бяседу,
Як быццам галавы ляцелі з плеч.
А грозны князь на гнеўную Рагнеду
Занёс са свістам харалужны меч.

І вось тады з сумежнага пакою
Як з-пад зямлі з'явіўся Ізяслаў
І лёгкі меч дзіцячаю рукою
На бацьку роднага караючы падняў...

Дзівіўся князь, дзівілася дружына.
Павісла ноч на выбітым акне.
І князь сказаў: — Бяры, Рагнеда, сына
І не паказвайся на вочы мне!

42

ЭПІЛОГ

З тае пары ля нашае сталіцы.
Маленькі горад князь пабудаваў.
І горад быў (хаця б не памыліцца)
Названы імем сына — Ізяслаўль.


У гэтым горадзе, пад нашым небам
сінім,
Святой манашкаю трынаццаць год
Жыла няшчасная крывіцкая княгіня,
Жыццё аддаўшая за волю і народ.

А сын яе, унучак Рагвалода,
Народны збаўца, слаўны Ізяслаў
Прынёс людзям жаданую свабоду
І княствам Полацкім да смерці кіраваў.

Не зарасці пракладзенаму следу!
І сёння ў грозную крывавую пару
Я слаўлю гордую крывіцкую Рагнеду,
Я слаўлю любую Радзіму — Беларусь!

Снежань, 1943 г.

г. Слуцак.





Лявон Шпакоўскі-Случанін. «Рагнеда» (гістарычная паэма).

Адказная за выпуск Мацюкевіч Марыя Сцяпанаўна.

Падрыхтавана да друку 4 кастрычніка 1994 года.

Аддрукавана ў Салігорскім гаспадарча-разліковым участку Слуцкай узбуйненай друкарні.

Наклад 999 паасобнікаў.